**К.Р. Карпекін**
Установа “Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці”

УДК 271.2-535:673.54 (476.5)”1910/1929”

# ЗВАНЫ ПРАВАСЛАЎНЫХ ЦЭРКВАЎ УСХОДНЯЙ ВІЦЕБШЧЫНЫ (КАНЕЦ 1910-х – 1920-я гг.)

*У даследаванні, праведзеным на аснове дакументаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, аналізуецца стан званоў праваслаўных цэркваў Усходняй Віцебшчыны ў канцы 1910-х – 1920-я гг. Вызначаны найбольш тыповыя для рэгіёну колькасць званоў у храмах, іх вага, час і месца вырабу, а таксама асаблівасці вонкавага выгляду.*

Ключавыя словы: *абраз, Віцебшчына, звон, праваслаўе, царква.*

У выніку палявых даследаванняў, праведзеных у пачатку XXI ст., у праваслаўных храмах Віцебскай вобласці было выяўлена 16 званоў, якія маглі б прэтэндаваць на статус гісторыка-культурнай каштоўнасці: 1 звон XVII ст., 6 – XVIII ст., 1 – XIX ст., 8 званоў – пачатку XX ст. [13, с. 95]. З улікам шматлікіх ваенных канфліктаў і сацыяльных катаклізмаў, якія мелі месца на тэрыторыі сучаснай Беларусі, можна меркаваць, што да сённяшніх дзён захаваліся далёка не ўсе царкоўныя званы. Вывучэнне гэтых важных царкоўных атрыбутаў неабходна для асэнсавання айчыннай матэрыяльнай і духоўнай культуры. Палявыя даследаванні важна спалучаць з вывучэннем архіўных дакументаў, што дапаможа вызначаць новыя накірункі пошукаў, а таксама ажыццяўляць атрыбуцыю аб’ектаў, захаваных у храмах і музеях.

Дадзенае даследаванне прысвечана званам праваслаўных цэркваў Усходняй Віцебшчыны – рэгіёну з даўнімі хрысціянскімі традыцыямі. Храналагічныя межы вызначаны канцом 1910-х – 1920-мі гг., якія варта лічыць перыядам наяўнасці максімальнай колькасці царкоўных званоў да іх знішчэння ў выніку савецкай антырэлігійнай палітыкі канца 1910-х – 1980-х гг. і ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг.

У ходзе даследавання было выкарыстана 3 групы архіўных крыніц:

1) вопісы маёмасці праваслаўных храмаў першай чвэрці XX ст. Як правіла, дадзеныя вопісы складаліся дзеля рэгістрацыі абшчыны і перадачы ёй у карыстанне пэўнай маёмасці, а таксама ў сувязі з канфіскацыйнай кампаніяй 1922 г. У такіх дакументах маюцца звесткі амаль выключна толькі пра колькасць званоў у той ці іншай царкве і іх вагу. Тым не менш, дадзеныя пра колькасць званоў варта лічыць найбольш поўнымі, паколькі ў іншых вывучаных крыніцах згадваюцца толькі найбольш прыкметныя з пункту гледжання складальніка дакумента вырабы. У прыватнасці, паводле вопісу 1919 г., у Петрапаўлаўскай царкве

ў в. Ласосіна Віцебскага павета было 3 званы [1, арк. 234], а пры яе наведванні ў 1925 г. было адзначана толькі 2 [6, арк. 31–31 адв.]. Падобная сітуацыя назіраецца і са Свята-Духаўскай царквой у с. Кабыльнікі таго ж павета: у 1919 г. у храме значылася 4 званы [1, арк. 237], у 1925 г. было апісана 2 з іх [6, арк. 34–35];

2) апытальныя лісты пра царкоўныя архівы і бібліятэкі за 1925 г., складзеныя пад час мэтанакіравана праведзенай кампаніі. У дадзеных дакументах былі згаданы толькі нечым адметныя званы, прыводзіліся звесткі пра час і месца вырабу, вагу, надпісы і выявы на іх. Можна меркаваць, што пры абследаванні храмаў і запаўненні такіх анкет прысутнічаў пэўны суб’ектывізм: некаторыя званы маглі падацца не дастаткова каштоўнымі, маглі існаваць і цяжкасці пры аглядзе званоў, змешчаных на значнай вышыні ў званіцах. У прыватнасці, у анкеце, датычнай царквы Архістраціга Міхаіла ў м. Калышкі Лёзненскага раёна, было пазначана, што старадаўніх званоў у храме не маецца [6, арк. 54]. Тым не менш, у 2010 г. у мястэчку быў знойдзены звон 1727 г., які, па ўсёй верагоднасці, выкарыстоўваўся ў храме і ў сярэдзіне 1920-х гг. (мал. 1, 2);



Мал. 1, 2. **Звон 1727 г., знойдзены ў 2010 г. у в. Калышкі Лёзненскага раёна, і выява, змешчаная на ім** (фотаздымкі з архіва аўтара)

3) спісы і фотаздымкі аб’ектаў культурнай вартасці, зробленыя супрацоўнікамі Дзяржаўнага мастацкага музея БССР пад час экспедыцыі ў 1982 г. Спісы дазваляюць атрымаць звесткі пра колькасць званоў у той ці іншай царкве, іх памеры, і, як правіла, прыкладны час іх вырабу.

Фотаздымкі з'яўляюцца крайне малалікімі: звычайна рабілася фотафіксацыя толькі тых званоў, якія былі зняты са званіц і захоўваліся ў падсобных памяшканнях. Інфармацыю з дадзеных крыніц магчыма выкарыстоўваць у якасці дапаможнай, бо па сутнасці, яна тычыцца толькі тых званоў, якія не былі знішчаны ў перыяд 1920-х – 1970-х гг.

Такім чынам, пералічаныя крыніцы дазваляюць прааналізаваць такія характарыстыкі царкоўных званоў Усходняй Віцебшчыны, як колькасць, вага, час вырабу, месца вытворчасці і вонкавы выгляд.

Мінімальна неабходнай лічылася наяўнасць у царкве 3 званоў, дастатковай для якаснага перазвону – 4 званоў. Як сведчаць архіўныя дакументы, для Усходняй Віцебшчыны найбольш тыповымі з'яўляліся цэрквы з 5 званамі (яны складалі каля 40% ад агульнай колькасці праваслаўных храмаў). У прыватнасці, па 5 званоў мелі Ануфрыеўская царква ў с. Заронава, Ільінская царква ў в. Серакаротня, Святаефрасінеўская царква ў с. Бабінічы Віцебскага павета [1, арк. 92 адв., 104; 4, арк. 55]. Каля чвэрці праваслаўных цэркваў рэгіёна карысталіся 4 званамі, сярод іх – Праабражэнская царква ў в. Сялюты Віцебскага павета, царква ў в. Віраўля Гарадоцкага павета [1, арк. 229; 5, арк. 20]. Храмы, у якіх налічвалася па 3 званы, складалі каля 14% (напрыклад, у царкве Нараджэння Багародзіцы ў в. Слабада Віцебскага павета [1, арк. 148 адв.]). Аднолькава нешматлікімі колькаснымі катэгорыямі з'яўляліся храмы з 2 і 6 званамі (па 7%). Так, 2 званы было ў Віцебскай Спаса-Праабражэнскай царкве, а 6 – у Свята-Пакроўскім храме ў в. Новікі Віцебскага павета [1, арк. 128; 6, арк. 12]. Цэрквы, дзе мелася 7 і больш званоў, з'яўляліся зусім не шматлікімі. У прыватнасці, 7 званоў лічылася ў Любашкаўскай царкве Віцебскага павета паводле вопісу 1919 г., 8 званоў – у Веляшкоўскай царкве таго ж павета паводле стану на 1922 г. [1, арк. 166, 231], 10 званоў – у Троіцкай царкве ў в. Арэхаўск Аршанскага раёна ў 1928 г. [12, арк. 2].

Што тычыцца вагі, то найбольшы (гэтак званы дабравесны) звон мусіў важыць, як усе астатнія званы разам узятыя, а вага кожнага наступнага звона мусіла складаць палову вагі папярэдняга. На практыцы такая заканамернасць выконвалася даволі рэдка, прычым самы вялікі звон звычайна важыў больш як у 2 разы цяжэй у параўнанні з наступным. Напрыклад, у 1922 г. у Пакроўскай царкве ў в. Замшына Віцебскага павета было 5 званоў, якія мелі вагу 14 пудоў 38 фунтаў, 5 пудоў 17 фунтаў, 3 пуды 4 фунты, 1 пуд 20 фунтаў, 20 фунтаў [1, арк. 174 адв.]. Больш таго, у некаторых храмах меліся аднолькавыя па вазе званы. У якасці прыкладу можна прывесці царкву ў м. Калышкі Віцебскага павета, у якой у 1923 г. было 2 званы вагой па 5 пудоў і 2 званы па 2 пуды [2, арк. 38].

У канцы 1910-х – 1920-я гг. праваслаўныя цэрквы Усходняй Віцебшчыны карысталіся разнастайнымі па вазе званамі: самы малы з выяўленых важыў 10 фунтаў (знаходзіўся ў Пакроўская царкве ў в. Стасева Віцебскага павета [4, арк. 144]), найцяжэйшы – 153,5 пуда (у Свята-Мікалаеўскай царкве ў с. Веляшковічы Віцебскага павета [1, арк. 166]).

Найбольш распаўсюджанымі ў рэгіёне былі званы вагой 20 фунтаў, 1 пуд, 1,5 пуда, 2 і 3 пуды (кожная з гэтых груп складала каля 10% ад агульнай колькасці, адпаведна, усе разам яны ўяўлялі палову ўсіх званоў). У прыватнасці, званы вагой 1, 2 і 3 пуды меліся ў Свята-Мікольскай царкве ў с. Курына Віцебскага павета, вагой 20 фунтаў і 2 пуды – у Праабражэнскай царкве ў в. Сялюты таго ж павета [1, арк. 81 адв., 229].

Архіўныя крыніцы сведчаць пра тое, што ў даследуемы перыяд часу праваслаўныя цэрквы карысталіся званамі, вырабленымі ў XVIII – пачатку XX ст. Званы XVIII ст. складалі амаль 25% ад агульнай колькасці, прычым у дакументах зафіксаваны вырабы як пачатку, так і канца стагоддзя (мал. 3). Напрыклад, у 1925 г. яны захоўваліся ў шэрагу цэркваў Высачанскага раёна: у Петрапаўлаўскай царкве ў с. Ласосіна – звон, адліты ў 1716 г., у с. Кабыльнікі – званы 1737 г. і 1789 г. [6, арк. 31 адв., 35]. У 1982 г. у Праабражэнскай царкве ў в. Смальяны Аршанскага раёна меўся звон 1794 г. [10, арк. 3].



Мал. 3. **Звон 1784 г. з Троіцкай царквы ў г. Дуброўна** (фотаздымак 1982 г.) [11, арк. 45]

Званы XIX ст. з'яўляліся самымі шматлікімі (іх доля сярод агульнага ліку дасягала амаль 45%). У прыватнасці, менавіта да згаданага перыяду адносіліся званы з Ільінскай царквы ў г.п. Бешанковічы [7, арк. 4–5] і Праабражэнскай царквы ў г. Чашнікі [9, арк. 4]. Астатнія 30% складалі званы, адлітыя ў пачатку XX ст. Напрыклад, вырабы згаданага перыяду меліся на званіцы Ільінскай царквы ў г. Оршы [8, арк. 5–6].

На жаль, архіўныя дакументы не дазваляюць вызначыць дакладнае месца вырабу званоў XVIII ст. З улікам таго, што на многіх з іх былі змешчаны польскамоўныя надпісы [6, арк. 34–35], можна меркаваць, што яны былі адліты ў людвісарнях Рэчы Паспалітай ці Заходняй Еўропы. Апроч таго, на званах пазначаліся імёны майстраў, што таксама мае непасрэднае дачыненне да месца іх вырабу. Напрыклад, звон 1727 г. з царквы Архістраціга Міхаіла з м. Калышкі Лёзненскага раёна быў адліты Фрыдэрыгам Кляйнам (мал. 1), а звон 1772 г. з Петрапаўлаўскай царквы ў с. Ласосіна Высачанскага раёна – Іаганам Аўкстам Гетцэлем [6, арк. 29].

Што да званоў XIX – пачатку XX ст., то яны былі выраблены, як правіла, у межах Расійскай імперыі: на заводах г. Масквы [1, арк. 200], заводзе С.М. Забенкіна ў г. Кастраме [1, арк. 264 адв.], заводзе

П.І. Алавянішнікава ў г. Яраслаўлі [6, арк. 80 адв.], заводзе братоў Усачовых у г. Валдаі [3, арк. 30 адв. – 31].

Усе званы змяшчалі на сабе тыя ці іншыя надпісы і пэўныя выявы. Як ужо адзначалася вышэй, тыя з іх, што адносіліся да XVIII ст., мелі надпісы на польскай мове (дадзеныя надпісы сведчылі пра час вырабу, імёны майстраў, ахвяраванне звона пэўнай асобай). Апроч таго, існавала практыка размяшчэння на званах малітоўных слоганаў на лаціне. Надпісы маглі размяшчацца ў верхняй, сярэдняй і ніжняй частках звона. Калі ж ён упрыгожваўся якойсьці выявай (абразамі Ісуса Хрыста, Божай Маці, святых), то надпісы рабіліся толькі зверху і ўнізе [6, арк. 29, 31–31 адв.].

Вонкавы выгляд званоў XIX – пачатку XX ст. быў у цэлым аналагічным. Надпісы ўтрымлівалі інфармацыю пра год (часам – дакладную дату) вырабу, месцазнаходжанне завода і яго ўладальніка, вагу звона, на чые ахвяраванні ён быў адліты. Пералічаныя надпісы дапаўняліся слоганамі-заклікамі, і калі выраб звона быў прымеркаваны да пэўнай падзеі, гэта таксама знаходзіла сваё адлюстраванне ў адпаведным тэксце.

Згаданыя слоганы-заклікі звычайна размяшчаліся ў верхняй частцы звона, астатнія – у ніжняй. Напрыклад, на звоне Праабражэнскай царквы ў с. Каралёва Высачанскага раёна меўся звон з заклікам: “Благовествуй земле радость велию. Хвалите небеса Божью славу” [6, арк. 80 адв.]. У царкве, што дзейнічала ў с. Веляшковічы, у 1925 г. меліся званы са слоганамі: на першым – “Гласу будь сему послушен, если царства ищешь ты, никогда не будь ослушен – в храм иди от суеты”, “Благовествую Земле радость велию, хвалити Божию славу”, на другім – “Свят, свят, свят Господь Саваоф”, на трэцім – “Разноплеменный край от заблуждений пробуждай, а правой вере ты звони, к селенью Божьему зови” [3, арк. 19].

У цэрквах Усходняй Віцебшчыны меліся званы, адлітыя з нагоды смерці імператара Аляксандра II, выратавання Аляксандра III і яго сям’і ў 1888 г., пераносу мошчаў Ефрасінні Полацкай з Кіева, 50-годдзя адмены прыгоннага права і інш. [3, арк. 19; 6, арк. 80 адв.].

Нярэдка званы XIX – пачатку XX ст. мелі па некалькі выяў, змешчаных па чатырох баках на адным узроўні (у сярэднім поясе), і найчасцей гэта былі абразы Ісуса Хрыста, Божай Маці і Святога Мікалая. Чацвертая выява магла залежаць ад таго, каму быў прысвечаны храм: так, на звоне Ануфрыеўскай царквы ў с. Заронава Віцебскага павета мелася выява Прападобнага Ануфрыя, а на звоне Пакроўскай царквы ў с. Жукава Езярышчанскага раёна – абраз “Пакроў Святой Багародзіцы” [1, арк. 92 адв.; 3, арк. 30 адв. – 31].

Такім чынам, званы праваслаўных цэркваў з’яўляюцца адметнымі помнікамі духоўнай і матэрыяльнай культуры. У канцы 1910-х – пачатку 1920-х гг. праваслаўныя храмы Усходняй Віцебшчыны працягвалі карыстацца званамі, вырабленымі яшчэ ва ўніяцкіх традыцыях і адначасова званамі, адлітымі на заводах Расійскай імперыі, што сведчыла

пра існуючыя традыцыі талерантнасці. У згаданы перыяд тыповым зяўляўся храм з 5 званамі, найбольш распаўсюджаныя сярод якіх важылі 20 фунтаў, 1 – 3 пуды. Надпісы і выявы на званах мелі дастаткова ўніфікаваны характар і неслі як прыкметы канфесійнай прыналежнасці, так і звесткі, важныя для вызначэння абставін стварэння звона.


1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Фонд 104. Воп. 3. Спр. 8.
2. ДАВц. – Фонд 160. Воп. 1. Спр. 3.
3. ДАВц. – Фонд 289. Воп. 1. Спр. 59.
4. ДАВц. – Фонд 571. Воп. 1. Спр. 23.
5. ДАВц. – Фонд 1947. Воп. 1. Спр. 12.
6. ДАВц. – Фонд 1947. Воп. 1. Спр. 19.
7. ДАВц. – Фонд 1439. Воп. 6. Спр. 6.
8. ДАВц. – Фонд 1439. Воп. 6. Спр. 7.
9. ДАВц. – Фонд 1439. Воп. 6. Спр. 27.
10. ДАВц. – Фонд 1439. Воп. 6. Спр. 28.
11. ДАВц. – Фонд 1439. Воп. 6. Спр. 36.
12. ДАВц. – Фонд 1439. Воп. 6. Спр. 37.
13. Шатько, Е. Г. Исторические колокола Беларуси: итоги научного исследования и паспортизации / Е. Г. Шатько // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі : навукова-тэарэтычны часопіс. – 2018. – № 32. – С. 91–101.



**Ю.А. Лабынцев, Л.Л. Щавинская**
Федеральное государственное бюджетное учреждение науки
Институт славяноведения Российской академии наук



УДК 271.2-726.1:091


# СВЯТИТЕЛЬ ГЕОРГИЙ (КОНИССКИЙ) В РУКОПИСНОЙ «ИСТОРИИ МОГИЛЕВСКОЙ ПРАВОСЛАВНОЙ ЕПАРХИИ» СЕРЕДИНЫ XIX В.: ЕЕ АВТОР, ИСТОЧНИКИ И РЕДАКТОР


*Хранящаяся в собрании документов Святейшего Синода, ныне сберегающихся в РГИА, рукопись «Истории» является важным свидетельством развития изучения судеб православия на белорусских землях. Ее автор, С.И. Соколов, использовал как рукописные, так и различные печатные источники, позволившие на основании собственных многолетних занятий, написав обстоятельную хронику Могилевской губернии, достаточно быстро подготовить под наблюдением и с помощью епископа Анатолия (Мартыновского) 300-страничную историю Могилевской епархии, в которой и по объему и по значению особое место было отведено Святителю Георгию.*



Ключевые слова: *Православие на белорусских землях, Святитель Георгий (Конисский), Могилевская православная епархия.*